Гісторыя Даўгінаўскай школы

У клас расчыненыя дзверы:<br>
Дошка, крэйда, ліст паперы,<br>
Стол і крэсла, парты ў рад,<br>
Тут вучыцца кожны рад.<br>
П. Прануза

## Гістарычныя звесткі

1862 год –год заснавання народнага вучылішча, у якім займалася каля 70 дзяцей.

У пачатку ХХ стагоддзя Даўгінаўскае народнае вучылішча перайменавана ў Даўгінаўскае двухкласнае вучылішча Міністэрства народнай адукацыі, дырэктарам якога быў Антановіч.

Даўгінава знаходзілася на тэрыторыі Заходняй Беларусі з 1920 па 1939 год. У гэты час у мястэчку працавала сямікласная пачатковая школа. Першым кіраўніком і арганізатарам яе быў Максіміліян Матрос. Працаваў у школе да 1935 года. Затым кіраўніцтва школай перайшло да Станіслава Зімодры, таленавітага, самаадданага чалавека.

У гэты ж час у школе працавалі цудоўныя настаўнікі: Ганна Андраловіч-Саха, Казімір Гандэла, Вітольд Канафоўскі, Адольф Лінковіч, Уладзіслаў Эймант, Стэфанія Казімірска, Генрых Кавалеўскі, Дарота Самулевіч, Вінцэнт Кунцэвіч, Ганна Трацэўска… Спіс гэты можна доўжыць, кожны настаўнік быў непаўторнай асобай, тым, з каго бралі прыклад вучні.

Да Вялікай Айчыннай вайны ў Даўгінаве пражывала каля трох тысяч яўрэяў, пагэтаму паралельна з асноўнай школай працавала і яўрэйская, у якой з 1898 па 1899 гг. вучыўся вядомы ў будучым беларускі пісьменнік Змітрок Бядуля.

Пасля аб’яднання Заходняй і Усходняй Беларусі навучанне дзяцей не спынялася. Яны наведвалі школу-сямігодку, першым дырэктарам якой быў Лявоненка.

1939-1945 гады – Даўгінаўская сямігадовая школа.

З 1945 года – Даўгінаўская сярэдняя школа.

Будынак школы па вул. Савецкая, у якім вучні займаліся да 1957 года.



У 1957 годзе адбылася рэарганізацыя дзіцячага дома. Школа перасяляецца ў яго будынкі, да якіх дабудоўваюцца прыстройкі.



Будынак старой  школы з прыстройкамі праіснаваў да 1993 года. У ім праводзіліся заняткі ВВК (вучэбна-вытворчага камбіната). Пасля заканчэння  ВВК  вучні атрымлівалі прафесіі шафёра, трактарыста, швачкі.



Сучасны будынак быў пабудаваны  ў 1975 годзе.



Школа ў 2022 годзе пасля мадэрнізацыі

